# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 3(49) 2006**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Палітalогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
*(нам. галоўнага рэдактара)*
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
*(нам. галоўнага рэдактара)*
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч

Весці БДПУ №3
(сер 3), 2006

## Змест

### Гісторыя

*Бушчык Г. П.* Мінск у міжрэспубліканскіх эканамічных сувязях (1950—1990 гг.) ........ 3

*Янкоўская Т. У.* Передумовы распрацоўкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Беларусі ........ 11

*Вялікі А. Ф.* Савецка-германскі пратакол аб перасяленні насельніцтва ад 28 верасня 1939 г. і яго выкананне ў Беларусі ў 1939—1940 гг. ........ 15

*Крывіцкі Д. С.* Германскія спецслужбы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (май 1941 — сакавік 1942 г.) ........ 18

*Пуцік У. С.* Аграрна-сялянскія праблемы ў праграмах і дзейнасці партый і грамадскіх рухаў правага кірунку ў Беларусі падчас Першай расійскай рэвалюцыі ........ 22

*Біндараў А. В.* Роля царкоўнапрыходскіх школ у правядзенні нацыянальна-рэлігійнай палітыкі ў Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. ........ 26

*Цымбал А. Г.* Усталяванне аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы ў першай палове 20-х гг. XX ст. ........ 30

*Крывіцкая К. В.* Прафранцузскія настроі насельніцтва Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай воласці напярэдадні вайны 1812 г. ........ 34

*Груца І. А.* Версіі лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона, звязаныя з азёрамі Семлеўскае і Стаячае, іх крытыка ........ 37

*Калечыц І. Л.* Эпіграфічныя помнікі X — першай паловы XIV ст. як адлюстраванне сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ........ 41

*Цзян-Шу-і.* Расійска-тайваньскія адносіны ў пачатку 90-х гг. XX ст. станаўленне «тайванязнаўства» ў Расіі ........ 43

### Філасофія

*Кавалевіч М. С.* Станаўленне сінергетычнага падыходу а даследавання працэсаў прафесійнага самавызначэння ........ 47

*Юрашэвіч І. П.* Усходнеславянскі цывілізацыйны тып у сістэме ыялогу культур Усходу і Захаду ........ 50

*Васько І. І.* Асэнсаванне прыроды і прызначэння дзяржаўнай улады учаснай сацыяльнай думцы Рускай Праваслаўнай Царквы ........ 54

### Палітalогія

чанка В. А., Паўлава Н. В., Сцяпанаў Г. І. Станаўленне ртыйнасці як умова фарміравання грамадзянскага ства ў Рэспубліцы Беларусь ........ 61

умаў Дз. І., Саланінка А. Дз. Рэфармацыя и генезіс палітычнай ы беларускага соцыуму ........ 63

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 930.27(476)

*І. Л. Калечыц*

# ЭПІГРАФІЧНЫЯ ПОМНІКІ X — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIV ст. ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ, ПАЛІТЫЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАЦЭСАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Пісьмовыя крыніцы, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі і датуемыя X — першай паловай XIV ст., даследаваны вельмі слаба. Вядома, што ў акрэслены перыяд у Полацку, Віцебску, Тураве, Навагрудку існавалі летапісныя цэнтры. Але летапісы не захаваліся да нашых дзён. Іх фрагменты былі знойдзены даследчыкамі ў летапісных спісах больш позніх часоў. Амаль адзінымі пісьмовымі крыніцамі па гісторыі Беларусі ў даследуемы час з'яўляюцца эпіграфічныя помнікі, якіх на тэрыторыі Беларусі знойдзена дастатковая колькасць (у асноўным, у выніку археалагічных даследаванняў). Даследаванні эпіграфічных помнікаў мелі крыніцазнаўчы кірунак і амаль не выкарыстоўваліся для разгляду складаных працэсаў палітычных падзей, пытанняў сацыяльнага, эканамічнага і культурнага развіцця рэгіёну, высвятлення асаблівасцей нацыянальнага, рэлігійнага складу насельніцтва Беларусі.

Перыяд X—першай паловы XIV ст. на беларускіх землях характарызуецца з'яўленнем першых княстваў-дзяржаў, іх узмацненнем, паступовым пераходам да феадальнай раздробленасці з наступным аб'яднаннем у складзе Вялікага княства Літоўскага. Па ўсёй тэрыторыі старажытнай Беларусі пачынаюць узнікаць гарады, што з'яўляецца «яркім сведчаннем высокага ўзроўню эканамічнага і сацыяльнага развіцця» [1, с. 142]. У той жа час адбываецца росквіт рамёстваў, якіх налічвалася «каля 60» [2, с. 64] разнавіднасцей. Даследаванні апошніх гадоў паказалі, што пісьменнымі былі не толькі прадстаўнікі ўлады і духавенства, але і рамеснікі, аб чым сведчыць, напрыклад, вялікая колькасць ювеліраў у Навагрудку, дзе знойдзены эпіграфічныя помнікі і прылады для пісьма. Нарыхтоўкі і вырабы з костак, дрэва з надпісамі знойдзены таксама ў Гродне, Полацку, Мінску, Гомелі. Берасцяныя граматы выяўлены ў Віцебску і Мсціслаўлі, што сведчыць на карысць пісьменнасці рамеснікаў.

Узнікненне гарадоў садзейнічала не толькі росквіту рамёстваў, але і актыўнаму гандлю. Няма сумненняў, што купцы былі людзьмі пісьменнымі. Ускоснымі ўказаннямі могуць служыць знаходкі фрагментаў амфар з надпісамі. З'яўленне гэтых надпісаў было выклікана неабходнасцю «обозначать содержимое сосуда и имя его владельца», паколькі «корчаги использовались не только для хранения продуктов, но и в качестве торговой тары» [3, с. 144]. Дзякуючы гандлёвым сувязям, на беларускія землі трапілі такія рэчы з надпісамі, як шкляны посуд з арабскімі добразычлівымі надпісамі (Навагрудак) і арабскім надпісам «Салім — вучоны» (Слонім), кальцо з лацінскімі літарамі, аналагі якому ёсць у Брытанскім музеі (Навагрудак), эмалевы абразок візантыйскай работы з надпісам А МАТОС і выявай святога Матфея (Капланцы), фрагмент бронзавай чашы з часткай надпісу, выробленай у заходнегерманскай майстэрні (Збароў). Дарэчы, Капланцы і Збароў з'яўляюцца феадальнымі сядзібамі. Феадальнай сядзібай, на якой знойдзена праселка з алфавітным надпісам і два пісалы, з'яўляецца і гарадзішча Вішчын.

Трэба дадаць, што эпіграфічныя помнікі з'яўляюцца рэчамі, зусім не характэрнымі для сельскіх паселішчаў. На сённяшні момант ніводнага з іх не было знойдзена на сельскім паселішчы. Усе яны былі адкрыты на тэрыторыі гарадоў ці феадальных сядзіб. Такім чынам, эпіграфічныя помнікі могуць устаць у адзін шэраг з амфарамі і іншымі «типичными недеревенскими вещами» [4, с. 139], пры наяўнасці якіх нават «городища малых размеров исключались из списка городищ сельского типа» [5, с. 121]. Вішчынскае праселка з'яўляецца прадстаўніком шэрага надпісных праселкаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, якія, у сваю чаргу, уваходзяць у сукупнасць рэчаў, знойдзеных на тэрыторыі Старажытнай Русі.Яны з'яўляліся не толькі спецыфічнымі прыладамі жаночай працы, але праселкі з надпісамі былі ўнікальным і важным сведчаннем жаночай пісьменнасці. Магчыма, надпісы часткова нанесены дарыльшчыкамі, але надпіс на такім спецыфічным прадмеце прадугледжваў яго чытанне і разуменне як гаспадыняй, так і іншымі асобамі. А. А. Мядынцава лічыць, што надпісы-азбукі на праселках былі «самым убедительным свидетельством обучения грамоте» [3, с. 145], прычым з дзяцінства. Аб гэтым сведчыць віцебскае праселка — падарунак бабулі змяшчае цікавую інфармацыю аб імёнах. Сярод надпісаў на праселках як царкоўныя, так і хатнія (паганскія) імёны. Адзначым, што праселкі адначасова з прадметамі культу даюць інфармацыю аб

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

размешчаны на замежных рэчах і ўспрымаюцца як элемент дэкору ці гарант якасці. Рунічныя надпісы сканцэнтраваны ў Маскавічах, адзінкавыя надпісы сустракаюцца ў Полацку, Рацюнках.

Такім чынам, можна заўважыць, што эпіграфічныя крыніцы X — першай паловы XIV ст. не адыгрываюць вядучай ролі ў вызначэнні гістарычных працэсаў, але даюць шматлікі дадатковы матэрыял па пытаннях сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства на тэрыторыі Беларусі. Праз іх мы атрымліваем звесткі па гісторыі эканомікі, сацыяльным і нацыянальным складзе насельніцтва, пытаннях рэлігійнага жыцця, праблемах культуры і пытаннях палітычнага становішча на беларускіх землях. Гэта дазваляе ўдакладніць многія пытанні гісторыі Беларусі перыяду сярэднявечча. Варта адзначыць, што эпіграфічныя помнікі X — першай паловы XIV ст. на тэрыторыі Беларусі маюць свае адметныя рысы і асаблівасці, адрозненні ад аналагічных крыніц іншых земляў, дзе пражывалі ў гэтыя часы ўсходнія славяне. Але акрамя адрозненняў маюць і агульныя рысы па форме і змесце крыніц. Гэта сведчыць аб удзеле ўсходнеславянскага рэгіёну ў агульным гістарычным працэсе, агульных кірунках і рысах развіцця эканомікі, сацыяльнай структуры і культуры, нягледзячы на розныя ўнутры- і знешнеэканамічныя ўмовы. Такім чынам, эпіграфічныя помнікі ў комплексе з іншымі крыніцамі даюць аб'ектыўную карціну мінулага нашага народа.

*Літаратура і крыніцы*

1. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000.
2. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1998.
3. Археология. Древняя Русь. Быт и культура. М., 1997.
4. *Загорульский Э. М.* Археология Белоруссии. Минск, 1965.
5. *Рыбаков Б. А.* Ремесло Древней Руси. М.; Л., 1948.
6. *Дучыц Л. В.* Этнический состав населения северо-запада Полоцкого княжества // История и археология Полоцка и Полоцкой земли : материалы конф. Полоцк, 1987. С. 19—20.
7. *Дучиц Л. В., Мельникова Е. А.* Надписи и знаки на костях с городища Масковичи // Древнейшие государства на территории СССР : материалы и исследования. 1980. М., 1981. С. 185—216.
8. *Дучыц Л. У.* Браслаўскае Паазер'е ў IX—XIV стст. Мінск, 1991.

*Summary*

*In the article totality of the epigraphic monuments of Belarus in X—XIV*th *centuries is regard for the first time as a source of social—economic, political and cultural process on the territory of the medieval Belarus.*

*УДК 947.084.8:951.2*

***Цзян-Шу-і***

## РАСІЙСКА-ТАЙВАНЬСКІЯ АДНОСІНЫ Ў ПАЧАТКУ 90-х гг. XX ст. І СТАНАЎЛЕННЕ «ТАЙВАНЯЗНАЎСТВА» Ў РАСІІ

У пачатку 1990-х гг. у расійскім кітаязнаўстве з'явіўся новы напрамак — «тайванязнаўства». У гэты перыяд былі ініцыіраваны і паступова сталі частымі кантакты паміж расійскімі вучонымі і прадстаўнікамі Тайваня. У перыяд з 1992 па 1994 г. больш за дзесяць супрацоўнікаў Расійскай Акадэміі навук і звязаных з ёй навуковых устаноў былі запрошаны на Тайвань для чытання лекцый, удзелу ў навуковых сімпозіумах ці пабывалі там з азнаямленчымі візітамі. Вядучыя расійскія арганізацыі, якія займаюцца праблемамі кітаязнаўства, а менавіта Інстытут усходазнаўства РАН і Інстытут Далёкага Усходу РАН, у 1992 г. незалежна адзін ад аднаго стварылі два навуковыя цэнтры для вывучэння праблем Тайваня. У першай палове 1990-х гг. у Расіі было апублікавана больш навуковых работ па Тайваню, чым за некалькі дзесяцігоддзяў, што папярэднічалі 1991 г. Гэта важная тэндэнцыя ў развіцці расійскай кітаістыкі заслугоўвае асаблівай увагі, паколькі ў значнай ступені была звязана са станам расійска-тайваньскіх адносін у той час і новымі асаблівасцямі знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі.

Пачынаючы з 50-х гг. XX ст. урад Тайваня традыцыйна праводзіў палітыку адмовы ад любых кантактаў з камуністычнымі рэжымамі і забараняў сваім грамадзянам падтрымліваць з СССР ці краінамі савецкага блока якія-небудзь сувязі. Змяненні ў палітыцы Тайбэя адбыліся ў 1979 г., калі былі перапынены дыпламатычныя адносіны паміж Тайванем і ЗША. 30 лістапада 1979 г. урад Тайваня дазволіў наладзіць прамыя эканамічныя адносіны з Югаславіяй, Венгрыяй, ГДР, Чэхаславакіяй і Польшчай, а таксама дазволіў грамадзянам Тайваня ўдзельнічаць у праводзімых у краінах сацлагера міжнародных канферэнцыях. 6 снежня таго ж года Кітайская Рэспубліка (афіцыйная назва Тайваня) афіцыйна абвясціла

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знаходзіцца на замежных рэчах і ўспрымаюцца як элемент дэкору ці гарант якасці. Рунічныя надпісы сканцэнтраваны ў Маскавічах, адзінкавыя надпісы сустракаюцца ў Полацку, Рацюнках.

Такім чынам, можна заўважыць, што эпіграфічныя крыніцы X — першай паловы XIV ст. не адыгрываюць вядучай ролі ў вызначэнні гістарычных працэсаў, але даюць шматлікі дадатковы матэрыял па пытаннях сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця грамадства на тэрыторыі Беларусі. Праз іх мы атрымліваем звесткі па гісторыі эканомікі, сацыяльным і нацыянальным складзе насельніцтва, пытаннях рэлігійнага жыцця, праблемах культуры і знешнепалітычнага становішча на беларускіх землях. Гэта дазваляе ўдакладніць многія пытанні гісторыі Беларусі перыяду сярэднявечча. Трэба адзначыць, што эпіграфічныя помнікі X — першай паловы XIV ст. на тэрыторыі Беларусі маюць свае адметныя рысы і асаблівасці, адрозненні ад аналагічных крыніц іншых рэгіёнаў, дзе пражывалі ў гэтыя часы ўсходнія славяне. Але акрамя адрозненняў маюцца агульныя рысы па форме і змесце крыніц. Гэта сведчыць аб удзеле ўсходнеславянскага рэгіёну ў агульным гістарычным працэсе, агульных кірунках і рысах развіцця эканомікі, сацыяльнай структуры і культуры, нягледзячы на розныя ўнутры- і знешнеэканамічныя ўмовы. Такім чынам, эпіграфічныя помнікі ў комплексе з іншымі крыніцамі даюць аб'ектыўную карціну мінулага нашага народа.

*Літаратура і крыніцы*


1. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000.
2. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1998.
3. Археология. Древняя Русь. Быт и культура. М., 1997.
4. *Загорульский Э. М.* Археология Белоруссии. Минск, 1965.
5. *Рыбаков Б. А.* Ремесло Древней Руси. М.; Л., 1948.
6. *Дучыц Л. В.* Этнический состав населения северо-запада Полоцкого княжества // История и археология Полоцка и Полоцкой земли : материалы конф. Полоцк, 1987. С. 19—20.
7. *Дучиц Л. В., Мельникова Е. А.* Надписи и знаки на костях с городища Масковичи // Древнейшие государства на территории СССР : материалы и исследования. 1980. М., 1981. С. 185—216.
8. *Дучыц Л. У.* Браслаўскае Паазер'е ў IX—XIV стст. Мінск, 1991.



*Summary*

*In the article totality of the epigraphic monuments of Belarus in X—XIV th centuries is regard for the first time as a source of social—economic, political and cultural process on the territory of the medieval Belarus.*


УДК 947.084.8:951.2

**Цзян-Шу-і**

## РАСІЙСКА-ТАЙВАНЬСКІЯ АДНОСІНЫ Ў ПАЧАТКУ 90-х гг. XX ст. І СТАНАЎЛЕННЕ «ТАЙВАНЯЗНАЎСТВА» Ў РАСІІ

У пачатку 1990-х гг. у расійскім кітаязнаўстве з'явіўся новы напрамак — «тайваназнаўства». У гэты перыяд былі ініцыіраваны і паступова сталі частымі кантакты паміж расійскімі вучонымі і прадстаўнікамі Тайваня. У перыяд з 1992 па 1994 г. больш за дзесяць супрацоўнікаў Расійскай Акадэміі навук і звязаных з ёй навуковых устаноў былі запрошаны на Тайвань для чытання лекцый, удзелу ў навуковых сімпозіумах ці пабывалі там з азнаямленчымі візітамі. Вядучыя расійскія арганізацыі, якія займаюцца праблемамі кітаязнаўства, а менавіта Інстытут усходазнаўства РАН і Інстытут Далёкага Усходу РАН, у 1992 г. незалежна адзін ад аднаго стварылі два навуковыя цэнтры для вывучэння праблем Тайваня. У першай палове 1990-х гг. у Расіі было апублікавана больш навуковых работ па Тайваню, чым за некалькі дзесяцігоддзяў, што папярэднічалі 1991 г. Гэта важная тэндэнцыя ў развіцці расійскай кітаістыкі заслугоўвае асаблівай увагі, паколькі ў значнай ступені была звязана са станам расійска-тайваньскіх адносін у той час і новымі асаблівасцямі знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі.

Пачынаючы з 50-х гг. XX ст. урад Тайваня традыцыйна праводзіў палітыку адмовы ад любых кантактаў з камуністычнымі рэжымамі і забараняў сваім грамадзянам падтрымліваць з СССР ці краінамі савецкага блока якія-небудзь сувязі. Змяненні ў палітыцы Тайбэя адбыліся ў 1979 г., калі былі перапынены дыпламатычныя адносіны паміж Тайванем і ЗША. 30 лістапада 1979 г. урад Тайваня дазволіў наладзіць прамыя эканамічныя адносіны з Югаславіяй, Венгрыяй, ГДР, Чэхаславакіяй і Польшчай, а таксама дазволіў грамадзянам Тайваня ўдзельнічаць у праводзімых у краінах сацлагера міжнародных канферэнцыях. 6 снежня таго ж года Кітайская Рэспубліка (афіцыйная назва Тайваня) афіцыйна абвясціла

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ